Источник: "Звязда" - 2013-04-17

Даты | Падзеі | Людзі

**1547** год — нарадзіўся Мацей Стрыйкоўскі, гісторык і паэт. З 1570 года жыў у Беларусі і Літве. Выклаў кароткую гісторыю Польшчы і ВКЛ у вершаванай хроніцы «Ганец цноты». Твор «Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі» — каштоўны дакумент па гісторыі славянскіх народаў, у якім выкарыстаны беларуска-літоўскія летапісы і хронікі. Памёр каля 1590 года.

**1939** год — Савецкі Саюз накіраваў Францыі (а на наступны дзень і Англіі) прапанову заключыць паміж трыма дзяржавамі дагавор аб узаемадапамозе супраць агрэсіі. У тым ліку — і аб дапамозе ваеннай. Англічане і французы, якія незадоўга да таго падпісалі Мюнхенскі дагавор з гітлераўскай Германіяй, занялі ў дачыненні да перамоў з СССР тактыку затрымак і выпустошвання канкрэтных савецкіх прапаноў. Праз гады стала вядомай ацэнка, дадзеная гэтай тактыцы прэзідэнтам ЗША Франклінам Рузвельтам. Ён сказаў, што англічане паводзяць сябе так, быццам гаворка ідзе не пра найважнейшы міжнародны дагавор, а аб куплі ўсходняга дывана на базары: чапляюцца да кожнай дробязі і дадаюць па пенсе кожныя паўгадзіны. Вельмі павольна ў Маскву паступалі адказы на савецкія прапановы; англа-французская дэлегацыя, якая прыбыла ў савецкую сталіцу, складалася з другасных чыноўнікаў і не мела паўнамоцтваў. У рэшце рэшт на зыходзе жніўня СССР перапыніў перамовы з гэтай дэлегацыяй і заключыў пакт аб ненападзе з Германіяй.



**1947** год — у Мінску заснаваны Цэнтральны батанічны сад Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Калекцыйны фонд складае каля 10 тысяч відаў, формаў, гатункаў раслін (аранжарэйных, драўняна-хмызняковых, кветкава-дэкаратыўных, лекавых, пладова-ягадных і інш.). Асноўныя кірункі работы — інтрадукцыя і акліматызацыя раслін, навуковыя асновы зялёнага будаўніцтва і аховы навакольнага асяроддзя, біяхімія і біятэхналогія раслін. Сад падтрымлівае навуковыя сувязі і абменьваецца матэрыяламі з многімі батанічнымі садамі і навукова-даследчымі ўстановамі больш чым 40 краін.

## Было сказана

**Сяргей ДЗЯРГАЙ (1907-1980), паэт і перакладчык:**

*«Бывае, сум агорне, змога,*
*А дзень за днём — паўзе з начы...*
*Куды мне бегчы ад сябе самога?*
*Не, ад сябе самога не ўцячы!».*